КРОКІ ТВАЕ, БЕЛАРУСЬ

«Беларусь, мая Радзіма, як жа расцвіла ты!». Так называецца кніжная выстаўка, якая арганізавана ў аддзеле беларускай і краязнаўчай літаратуры абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.

Выстаўка адлюстроўвае паўстогадовы шлях нашай рэспублікі. Шырока прадстаўлена літаратура аб баявым атрадзе КПСС — Камуністычнай партыі Беларусі на ўсіх этапах яе дзейнасці. Вялікую цікавасць уяўляе раздзел «Кастрычніку вечная, вечная слава», прысвечаны падзеям 1917 года ў рэспубліцы і вобласці. Пастаянным попытам у чытачоў карыстаюцца двухтомнік дакументаў і матэрыялаў «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі», «Хроніка падзей перыяду падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі», кніга ўспамінаў «У барацьбе за Кастрычнік у Беларусі і на Заходнім фронце», «Перамога Савецкай улады ў Беларусі», «Кастрычнік у Беларусі».

Хвалюючыя матэрыялы выстаўлены ў раздзеле «Гады навальнічныя». Кожная кніга расказвае аб гераізме, мужнасці беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аб укладзе віцяблян у перамогу над ворагам. Вось некаторыя з іх: «Усенародны партызанскі рух у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», зборнік успамінаў і артыкулаў «Нескароная Беларусь», «Партызанская рэспубліка» П. З. Калініна, «У баях за Радзіму» У. Е. Лабанка, «Вайна ў краі азёр» І. К. Захарава, «Зарава над юнацтвам» В. Люкава і Ю. Панова і іншыя. Сутнасць гэтага раздзела выстаўкі яскрава выражаюць словы нашага земляка лаўрэата Ленінскай прэміі Петруся Броўкі:

Трэба адрэзаць дарогу
для войнаў,
Каб чалавецтва магло
жыць спакойна.

Літаратуры аб першых пяцігодках, камуністычным будаўніцтве ў рэспубліцы, развіцці навукі, культуры і мастацтва прысвечан раздзел «Радуемся маршу, якім ідзём».

Л. БЯЗЗУБІК,
загадчык аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.